ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.14(3230) ● ЧАЦВЕР, 14 КРАСАВІКА, 2011

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**

Аўтограф з мінуўшчыны
Рэстаўратары Сынковіцкай царквы-крэпасці знайшлі сведчанні таго, што яна існавала ўжо ў XIV стагоддзі Стар. 2

Белавежскі радавод Інакенція Смактуноўскага
Стар. 3

Жартаўлівая муза Алега Карповіча
Ён мае свой адметны почырк, малюе хутка, шмат, ды яшчэ з добрым гумарам і густам Стар. 4

ПРЫЯРЫТЭТЫ

Вечныя каштоўнасці,
альбо Выхаванне мастацтвам

На пасяджэнні Рэспубліканскага грамадскага савета па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Беларусі, якое праходзіла ў Гомелі, гаворка вялася аб тым, што культура павінна быць выхаваўчай сілай праз усё жыццё

Адам Мальдзіс

ЮРЫЙ ІВАНОЎ

У кулуарах пасяджэння гаспадарылі юныя мастакі

Безумоўна, мы спасцігаем шматмерны свет не толькі логікай, але і скарыстоўваючы мастацкія вобразы. А што будзе, як возьме верх толькі рацыянальны пачатак? Чалавек ператворыцца ў бяздушнага робата, тэхнакрата. Ёсць свае мінусы і ў празмерным дамінаванні эмоцый. Варта шукаць залатую сярэдзіну. Так разважаў я па дарозе ў Гомель і ўжо ў аўтобусе падзяліўся думкамі з Аленай Гуляевай. Мы знаёмыя гадоў дваццаць, раней яна, дырыжор, з поспехам гастралявала па ўсёй Еўропе з дзіцячым хорам. А цяпер, аказваецца, навукова асэнсоўвае мастацкую практыку, працуе намеснікам начальніка ўпраўлення навукова-метадычнага суправаджэння адукацыйнага працэсу ў Нацыянальным інстытуце адукацыі.

— Зусім нядаўна я пабачыла, як арганічна спалучаюцца лагічнае і эстэтычнае светабачанне, прычым на працягу ўсяго жыцця чалавека, у Паўднёвай Карэі, — ахвотна прадоўжыла размову мая знаёмая. — Была там на канферэнцыі ЮНЕСКА, расказвала пра беларускія традыцыі такога выхавання. Мяне прыемна здзівіла вельмі натуральнае, нязмушанае імкненне як карэйскіх дзяржаўнікаў, фінансістаў, так і людзей бізнесу ўкладваць сродкі і сілы ў эстэтычнае выхаванне розных пакаленняў. Эліта грамадства там разумее: без вобразнага бачання свету не будзе і крэатыўнага дзеяння, а значыць, і эканамічнага прагрэсу.

У Гомелі прама пры ўездзе у горад гасцей з Мінска песняй вітаў мастацкі калектыў. А каля ўваходу ў палацава-паркавы комплекс Румянцавых і Паскевічаў мяне ўжо чакала дырэктар Гомельскага гарадскога музея Юлія Някляева. І пакуль іншыя калегі па грамадскім савеце аглядалі палац і знаёміліся з гомельскімі талентамі, мы ў музеі разам з краязнаўцамі, студэнтамі-музеязнаўцамі гутарылі пра лёсы вывезеных з Гомельшчыны мастацкіх скарбаў. Што ж, гэта лагічна: перш чым выхоўваць людзей на лепшых творах мастацтва — трэба іх проста бачыць перад сабой.

Куды былі вывезены ў 1941 годзе экспанаты з палаца? Дзе апынуўся цудатворны абраз Маці Божай Юравіцкай? Ці нельга вярнуць што-небудзь з таго, што трапіла з агромністых збораў Румянцава ў Маскву? Гэта асноўныя пытанні, вакол якіх вялася гаворка. І падсумаваць адказы коратка можна так. Легенды пра тое, што гомельскія каштоўнасці аселі дзесьці ў Валгаградзе ці Урупінску, не маюць пад сабой падставы. Помніцца, яшчэ ў 1989 годзе дырэктар Гомельскага музейнага ансамбля І. Казлоў адказаў мне, што адтуль яны чакаюць і не могуць дачакацца іх вяртання. → Стар. 2

Песні, якія аб’ядноўваюць

Кацярына Мядзведская

У Палацы культуры Мінскага трактарнага завода адбылася цёплая сустрэча з творчымі калектывамі з Вільнюса, Клайпеды і Даўгаўпілса, усе салісты якіх — нашы суайчыннікі

Разам з самай малодшай спявачкай з латышскага трыа “Ластаўкі” Верай Талеркай на канцэрт прыехала маці. Вельмі хвалявалася, здымала выступленні дачкі на відэа, трымала “кулачкі” — дзеля перамогі. Напрыканцы ўрэшце пачула: “Ластаўкі” за выкананне дзвюх песень — сучаснай латышскай і беларускай народнай — занялі трэцяе месца.

Разам з дыпломам і прызамі дзяўчаты павезлі з сабой шмат добрых уражанняў ад сустрэчы з Радзімай. У іх нават ёсць песня на словы паэта Станіслава Валодзькі “Сустракай, Беларусь, сваіх дочак, сыноў” — якраз пра тое, з якой радасцю землякі прыязджаюць у родную краіну, а ад’язджаюць заўсёды акрыленыя, па-добраму ўзрушаныя. Вельмі насычаны ў калектыва гастрольны графік, і сёлета гурт ужо тройчы пабываў у Беларусі: дзяўчаты спявалі ў Віцебскай філармоніі, у Браславе, вось цяпер у Мінску. Напрыканцы вясны трыа справіць 10-гадовы юбілей. → Стар. 2

Дзяўчаты з ансамбля “Ластаўкі”

ВЕСТКІ

Мовай лічбаў

Алена Прусава

На жыццё паглядзелі з дапамогай дакладнай статыстыкі

У мінулым годзе рэальныя грашовыя даходы беларусаў з улікам некаторага росту цэн на тавары і паслугі павялічыліся на 15,4 працэнта. У параўнанні з 2009 годам, калі мы сталі багацей усяго на 2,9 працэнта, гэта дастойны вынік. Сярэдні памер пенсіі на канец 2010 года складаў 195 долараў. Для параўнання, ва Украіне пенсіянеры ў сярэднім атрымліваюць 145 долараў, а ў Расіі — 249. Па словах начальніка ўпраўлення статыстыкі ўзроўню жыцця насельніцтва і абследавання хатніх гаспадарак Беларускага статыстычнага камітэта Іны Канашонак, малазабяспечанымі можна лічыць усяго 5,2 працэнта насельніцтва. Затое на 100 сем’яў прыходзіцца 36 аўтамабіляў, і гэта на тры аўто больш, чым годам раней. Пакуль у гэтым паказчыку мы адстаем ад Расіі — там на 100 сем’яў прыпадае 47 аўтамабіляў, але апярэджваем Украіну, дзе 21 аўто.

Гасцям тут рады

Ірына Гардзіенка

Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі стала сапраўдным цэнтрам народнай дыпламатыі

На пашыранае пасяджэнне з нагоды 85-х угодкаў Дома дружбы сабраліся члены праўлення, прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў, актывісты. “Беларускае таварыства дружбы шмат робіць для фарміравання станоўчага іміджу сталіцы, Беларусі, — падкрэсліў на пасяджэнні намеснік старшыні Мінгарвыканкама Міхаіл Ціцянкоў. — Гэта прыклад таго, як народная дыпламатыя дапамагае ўмацоўваць міжнароднае супрацоўніцтва”.

Цяпер у склад БелТД уваходзяць 37 таварыстваў, якія маюць кантакты з краінамі Еўропы, Азіі і Амерыкі. Цесныя сувязі наладжаны з Германіяй, Бельгіяй, Францыяй, Польшчай, з імі БелТД ажыццяўляе гуманітарныя праграмы. Дзякуючы ініцыятыве замежных сяброў у Беларусь паступаюць лякарствы, медабсталяванне і іншыя гуманітарныя грузы. Тысячы дзяцей, якія пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы, змаглі адпачыць і паправіць здароўе ў маладзёжных цэнтрах, у сем'ях замежных партнёраў.

На ўдзельнікаў пасяджэння ў зале Гомельскага палаца са сцен глядзелі славутыя продкі

ПРЫЯРЫТЭТЫ

Вечныя каштоўнасці,
альбо Выхаванне мастацтвам

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Але чаканне ж дарэмнае. Бо, як паведаміў мне супрацоўнік валгаградскага музея "Старая Сарэпта" — а гэта наш суайчыннік, кіраўнік гарадскога Беларускага культурнага цэнтра "Спадчына" Віктар Мядзведзеў — у 1942 годзе, пры наступленні немцаў, каштоўнасці, вывезеныя ў Валгаград з Беларусі і Украіны, вырашылі пераправіць далей у тыл. Яны былі пагружаны на карабель і перавозіліся на левы бераг Волгі. Але дзесьці пасярэдзіне шляху ў транспарт трапіла нямецкая бомба, і ён пайшоў на дно. Там, пэўна, знаходзіцца па гэты час. Вядома ж, карціна "Забойства святога Стэфана" наўрад ці ацалела пад вадой, а вось каштоўныя мармуровыя скульптуры Леанарда да Вінчы можна было б пашукаць — гэта, як кажуць, справа тэхнікі…

Шанц вярнуць з Кракава цудатворны абраз візантыйскай школы Маці Божай Юравіцкай таксама ёсць. Наколькі мне вядома, мясцовая землеўладальніца Горват вывезла рэліквію ў кракаўскі касцёл Святой Барбары з агаворкай, што каштоўнасць будзе вернута ў Юравічы пры спрыяльных умовах. Па-мойму, яны ўжо наступілі. Патрэбна, казаў я гомельскім энтузіястам, толькі вашы хадатайніцтвы ды добрая воля духоўных асоб, ад якіх гэта залежыць. Акт вяртання, безумоўна, спрыяў бы паразуменню паміж каталіцкай і праваслаўнай канфесіямі.

І яшчэ пытанне. Перад гомельскім палацам нядаўна з'явіўся бюст канцлера Расіі графа Мікалая Румянцава. То можа ў Гомель вернуцца і яго калекцыйныя каштоўнасці, на базе якіх у Маскве ўзнікла славутая Румянцаўская бібліятэка, пазнейшая "Ленінка", а цяпер гэта Дзяржаўная бібліятэка Расіі? Наўрад ці. Каштоўнасці ж былі вывезены з Гомеля па ўласнай волі ўладальніка. Але варта нашым бібліязнаўцам паглядзець, што ёсць сярод дублікатаў Румянцаўскіх збораў, бо яны могуць перадавацца. Памятаю, калісьці такім чынам у полацкі Музей гісторыі беларускага кнігадрукавання вярнулі з "Ленінкі" прыжыццёвыя маскоўскія выданні Сімяона Полацкага…

Пасяджэнне грамадскага савета праходзіла ў адрэстаўраваным і ўпрыгожаным партрэтамі славутых людзей Гомельшчыны палацы, які акумуляваў у сабе вялікую гістарычна-культурна-мастацкую энергетыку. Гаворка вялася комплексная: апрача работнікаў культуры, мастацтва, у ёй удзельнічалі прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі і інфармацыі.

Між іншым, выступоўцы акцэнтавалі ўвагу на ненармальнасці сітуацыі, калі мастацтва як прадмет знікае з абавязковай школьнай праграмы пасля пятага класа. Гэта вельмі тармозіць развіццё творчых здольнасцяў і ўвогуле, кажучы мовай сацыёлагаў, развіццё чалавечага патэнцыялу. А значыць, праблема выхавання культурай і мастацтвам праз усё жыццё — дзяржаўная, вельмі важная для будучыні.

Па абмеркаваным пытанні прынята разгорнутае і канкрэтнае рашэнне.

Утульна разам "Крывічам"

Пётр Арэшка

Актывісты беларускіх суполак Прыбайкалля шануюць традыцыі

Нішто так не паядноўвае людзей, як сумесны ўдзел у народных абрадавых дзеях. У тым даўно пераканаліся і нашы землякі з Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага. "Мы ўжо 15 гадоў актыўна працуем на адраджэнне беларускіх абрадавых святаў, — паведамляе кіраўнік суполкі Алег Рудакоў. — Вось і сёлета актывісты маладзёжнага клуба "Крывічы" правялі "Гуканне Вясны".

Варта нагадаць пра сакрэт папулярнасці такіх масавых дзей сярод моладзі Іркуцка. Справа ў тым, што да святаў арганізатары грунтоўна рыхтуюцца. Пры гэтым вывучаюць глыбінны сэнс абрадаў, асаблівасці беларускага светаўспрымання і тое, як вераванні продкаў трансфармаваліся ў знакавыя рытуалы. Землякі шукаюць і развучваюць абрадавыя песні, гульні, танцы. Тады і становіцца ўсім зразумелым, чаму Вясну-Ладу, скажам, трэба абавязкова "загукаць" менавіта дзяўчатам ды жанчынам, навошта да свята робяць шмат птушак з тканіны (іх пад час Гукання развешваюць на дрэвах), а папяровых запускаюць у неба з гары...

Сёлета да традыцыйнага ўжо абрадавага месца за горадам, "на гару каля Яршоў", усіх жадаючых давёз спецыяльны аўтобус. Дзяўчаты спявалі заклічкі-вяснянкі, былі карагоды і гульні.

Адкрытыя ўрокі

Дар'я Аляксандрава

На міжнародным веснавым кірмашы "Адпачынак-2011" Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прадставіў пляцоўку "Партызанскі лагер"

Перад стэндам музея Вялікай Айчыннай вайны было шмат дзяцей. І нездарма, бо там упершыню прадстаўлялі пляцоўку "Партызанскі лагер". Вучні, што называецца, увачавідкі праходзілі пазакласны ўрок па гісторыі. Можна было пазнаёміцца з тым, як жылі беларускія партызаны, як рыхтаваліся да баявых аперацый, якія газеты выдавалі ў лясных друкарнях. Дарэчы, на экспазіцыі ўсе пабудовы былі выкананы ў натуральную велічыню ў адпаведнасці з дакументальнымі крыніцамі, а таксама па ўспамінах былых партызан.

Супрацоўнікі музея красамоўна расказвалі і пра ваенна-гістарычны комплекс "Мінскі ўмацаваны раён", што створаны на тэрыторыі цэнтра экалагічнага турызма "Станькава" пад Дзяржынскам. Менавіта там месцяцца экспазіцыйная пляцоўка ваеннай тэхнікі "Зброя Перамогі", поле для правядзення ваенна-гістарычных фестываляў "Лінія фронту". Туды ж да Дня Перамогі пераедзе і "Партызанскі лагер".

Вяртанне тэатральнага маршрута

У сталіцы ладзіцца экскурсія "Мінск тэатральны", якая была вельмі папулярная некалькі дзесяцігоддзяў таму

У сярэдзіне красавіка прайшла першая вучэбная праграма для экскурсаводаў. Дарэчы, аднаўленне сталічнай экскурсіі не стала паўторам старой праграмы. У ёй — шмат новай інфармацыі. Так, экскурсанты даведаюцца, дзе спачатку планавалі будаваць цырк, што звязвае са сталіцай знакамітага расійскага артыста Алега Янкоўскага і чаму акцёра запрасілі ў Лос-Анджэлес на цырымонію ўручэння "Оскара". Кансультант дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Беларусі Алена Салаўёва лічыць, што такая экскурсія павінна быць запатрабаванай, тым больш што сёння ў Мінску надаецца вялікая ўвага тэатральнаму мастацтву.

Так, у праграме экскурсіі па сталіцы ёсць і наведванне тэатраў. Прычым турысты самі выбіраюць, які з тых спектакляў, што ў гэты дзень ідуць у мінскіх тэатрах, варта паглядзець.

Песні, якія аб'ядноўваюць

Землякі з Літвы, Латвіі і Беларусі спявалі разам

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Да гэтай падзеі спявачкі рыхтуюцца загадзя: "Да творчага вечара выпусцілі дыск, — расказвае салістка Таццяна Піменава, — працуем над рэпертуарам, пашыраем яго. У нас шмат беларускіх народных і эстрадных песень, выкарыстоўваем творы паэтаў Ніны Мацяш і Станіслава Валодзькі".

Шмат часу дзяўчаты прысвячаюць рэпетыцыям. Нягледзячы на тое, што ў кожнай з іх ёсць сям'я і праца, па суботах заўсёды знаходзяць час для творчай сустрэчы. Наталлю Зубкову, у якой, дарэчы, нядаўна нарадзілася дзіця, у хатніх клопатах падмяняе муж. А Вера Талерка ўвогуле прыязджае на рэпетыцыі з Вільнюса, дзе вучыцца ва ўніверсітэце. "Спяваю беларускія песні яшчэ са школы. Беларускасць, пэўна, у мяне ў крыві, — прызнаецца дзяўчына. — Мой прадзядуля родам з былой Віцебскай губерні, а ў Даўгаўпілсе стварыў беларускую гімназію, якая існуе і цяпер, вельмі актыўна падтрымліваў родную культуру. У беларускім таварыстве "Уздым" цяпер не толькі я — і маці, і тата, і сястра старэйшая".

Вера, дарэчы, доўгі час наведвала нядзельную школу, што працуе пры "Уздыме". Менавіта там яна так добра і вывучыла мову. Школа плённа працуе і сёння, у ёй збіраюцца дзеці з беларускіх сем'яў з усяго Даўгаўпілса. А нядаўна там быў створаны сапраўдны лялечны тэатр. Выкладчыца Галіна Сантоцкая цудоўна ў казачных дзеях знаёміць малых з гісторыяй і традыцыямі беларусаў.

СПАДЧЫНА

Аўтограф з мінуўшчыны

Рэстаўратары Сынковіцкай царквы-крэпасці знайшлі сведчанні таго, што яна існавала ўжо ў XIV стагоддзі

У гісторыі Сынковіцкай царквы-крэпасці яшчэ шмат загадкавасці

Пад час рэстаўрацыйных работ на сценах самага старадаўняга ў Беларусі храма абарончага тыпу былі выяўлены графіці — напісаныя па тынку словы на латыні і славянскіх мовах, што датуюцца сярэднявеччам.

Як расказвае навуковы кіраўнік работ Генадзь Лаўрэцкі, на сценах царквы быў праведзены зандаж — зняцце слаёў тынку. Гэта неабходна, каб зразумець характар кладкі і ўбачыць сляды перабудоў. За час рэстаўрацыі, якая вядзецца з 2010 года, узноўлены элементы машыкуляў — навясных байніц, што размешчаны ў верхніх частках сцен і вежаў сярэдневяковых умацаванняў. Дзякуючы дапамозе студэнтаў расчышчаны вежы і зводы будынка. А ў гэтым годзе будзе адноўлены прытвор храма — своеасаблівы вестыбюль, які аддзяляе святое ад мірскога.

Цяпер лічыцца, што старадаўні беларускі помнік абарончага дойлідства быў пабудаваны ў часы праўлення каралевы Польскай і вялікай княгіні Літоўскай Боны Сфорцы — у XVI стагоддзі. Аднак у летапісах сцвярджаецца, што ўжо ў XIV стагоддзі ў царкве знайшоў прытулак князь Вітаўт, які пазней быў выбраны вялікім князем Літоўскім. Таму не выключана, што крэпасць у Сынковічах існавала і раней, а ў XVI стагоддзі была толькі перабудавана. У архітэктуры храма выразна прасочваюцца рысы, характэрныя для гатычнага стылю, а таксама дэталі старарускага дойлідства.

Крэпасць у вёсцы Сынковічы і цяпер дзейнічае. Яна вядомая сваёй цудадзейнай іконай Божай Маці "Усецарыца", што, кажуць, ацаляе ад розных хваробаў, і ўнікальнай акустыкай.

АСОБА

Добры след на зямлі

Кажуць, чалавек застаецца з намі, пакуль жыве памяць пра яго. Канферэнцыя ў гонар Язэпа Юхо, праведзеная на юрфаку Беларускага дзяржуніверсітэта, — яскравае сведчанне таго, што забыццё гэтаму таленавітаму педагогу і вялікаму навукоўцу не пагражае.

"Праблемы гісторыі дзяржавы і права Беларусі" — так называўся форум, прысвечаны 90-м угодкам Язэпа Юхо. Як не раз адзначалі выступоўцы, вядомы вучоны — не проста класік навуковай думкі ў галіне гісторыі і юрыспрудэнцыі, але і заснавальнік цэлай навуковай школы па гісторыі дзяржавы і права. Канферэнцыя сабрала розных даследчыкаў, найбольш было гісторыкаў і юрыстаў. Многім з іх вучоны даў пуцёўку ў навуковае жыццё, сотні вучыліся па працах мэтра завочна. У шэрагах выступоўцаў былі географы, філосафы і нават багаслоў. І мала хто — без навуковай ступені доктара ці кандыдата. Важкім было і замежнае прадстаўніцтва: аказалася, што навуковая спадчына Я. Юхо запатрабавана ў Літве, Расіі, Польшчы, Украіне. Напрыклад, прадстаўніца Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Т. Шаўчэнкі Марыя Грыцэнка прыехала з дакладам "Пераемнасць ідэй Я. Юхо ў сучаснай украінскай прававой медыявістыцы".

Язэп Юхо. Здымак ваенных гадоў

На пленарным паседжанні выступіў Генеральны пракурор Беларусі Рыгор Васілевіч. Шчыра і душэўна гаварылі пра свайго аднакурсніка Язэпа Аляксандравіча Сцяпан Драбязка і Ізабэла Марціновіч, якія таксама дасягнулі прафесарскіх вышынь, сталі дактарамі юрыдычных навук. У дакладах, дыскусіях на секцыях адкрываліся перспектывы далейшых даследаванняў у багатай гісторыі дзяржаўнасці і права. У прыватнасці, адзначалася, што гісторыя нашай дзяржаўнасці перарывалася толькі аднойчы — з уваходжаннем у Расійскую імперыю, ды і тады канстытуцыйны працэс заставаўся бесперапынным.

Да канферэнцыі дзякуючы спонсарам з ліку вучняў навукоўца выдадзена кніга ўспамінаў яго паслядоўнікаў і паплечнікаў, перавыдадзена манаграфія "Прававое становішча насельніцтва Беларусі ў XVI ст.". З імі можна азнаёміцца ў Нацыянальнай бібліятэцы і на сайце ўніверсітэта.

Анатоль Трафімчык,
кандыдат гістарычных навук,
супрацоўнік Інстытута
беларускай культуры

КАРАНІ

Белавежскі радавод Інакенція Смактуноўскага

Іна Ганчаровіч

Ні для каго не сакрэт, што з беларускай зямлі пачынаўся радавод дзясяткаў выдатных кампазітараў, пісьменнікаў, навукоўцаў, грамадскіх дзеячаў, акцёраў, якія сталі вядомымі ў іншых краінах. Сімяон Полацкі, Мікола Гусоўскі, Міхал Клеафас Агінскі, Тадэвуш Касцюшка, Фёдар Дастаеўскі, Марк Шагал, Міхаіл Глінка, Дзмітрый Шастаковіч... Спіс людзей розных нацыянальнасцяў з беларускімі каранямі можна доўжыць. У іх ліку і Інакенцій Смактуноўскі, таленавіты, любімы гледачамі акцёр савецкага кінематографа, якому ў сакавіку споўнілася б 86 гадоў.

Пра яго мінулае гаварылі па-рознаму, і сам ён часцяком заблытваў кінакрытыкаў некаторымі фактамі біяграфіі. Ды ў тым не зусім яго віна: раней многія ў сілу аб'ектыўных прычын вымушаны былі не надта афішаваць сваю "дакастрычніцкую" ці савецкую біяграфію. Вось і ў анкетах вялікага артыста з'яўляліся розныя запісы ў графе нацыянальнасць: яўрэй, паляк, рускі, беларус.

Але ёсць факты, якія ўпарта сведчаць менавіта пра беларускія карані Інакенція Смактуноўскага. Іх нагадаў Мікалай Чэркас, кандыдат біялагічных навук, у мінулым навуковы супрацоўнік Белавежскай пушчы, аўтар шэрагу навуковых артыкулаў і навукова-папулярных кніг. "Спецыяльна вывучэннем радаводу Інакенція Смактуноўскага я не займаўся, — гаворыць ён, — але, праглядваючы архіўныя матэрыялы пра пушчу, часам сустракаю цікавыя рэчы. У кнізе ўспамінаў самога акцёра, напрыклад, я прачытаў, што прадзеда Смактуноўскага па даносе сялян саслалі ў 1861 годзе ў Сібір быццам за браканьерства. Наогул жа сапраўднае прозвішча ў Інакенція — Смактуновіч. Нарадзіўся ў сяле Таццянаўка Томскай вобласці. Быў на фронце, трапіў у нямецкі палон, і хоць збег з яго, "пляма недабранадзейнасці" засталася. Калі працаваў акцёрам у Нарыльскім тэатры, недзе ў 1946 — 48 гадах, дырэктар і настаяў на такім псеўданіме. Ён лічыў, што прозвішча Смактуновіч нагадвае яўрэйскае, што магло ўскладніць і без таго няпросты лёс акцёра. Яшчэ вядома, што Якаў Смактуновіч, той самы прадзед Інакенція, які трапіў у Сібір, ажаніўся там з дачкой урадніка, які за ссыльным наглядаў. Адзін з сыноў Якава так і застаўся ў Сібіры — ад яго, магчыма, і пайшла лінія Смактуноўскага. Другі сын паступіў на службу на крэйсер "Расія", ён быў удзельнікам руска-японскай вайны. Дакументы сведчаць, што гэты другі сын быў католікам, трохі глухаватым ад пашкоджання барабанных перапонак, меў узнагароду — я бачыў наградны дакумент у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродне. Пасля заканчэння вайны ён вярнуўся ў Белавежскую пушчу, ад яго і вядуць радавод цяперашнія Смактуновічы. Некаторыя родзічы Інакенція Смактуноўскага і цяпер там жывуць".

Інакенцій Смактуноўскі — вядомы акцёр кіно і тэатра

Ёсць, аднак, версія, што і бацька акцёра быў падлоўчым з Белавежскай пушчы. Вось што расказвае Фёдар Саевіч, у мінулым ляснічы Ясенеўскага лясніцтва. "Я нарадзіўся, вырас, працаваў у Белавежскай пушчы, жыву ў вёсачцы Ясень. Некалькі гадоў таму глядзеў тэлеперадачу пра Смактуноўскага, і ён гаварыў, што бацька яго быў падлоўчым у Белавежскай пушчы, а перад Першай сусветнай вайной, як і многія, пакінуў гэтыя месцы — з'ехаў у Сібір. А разам са мной тады працаваў ляснічым Смактуновіч Анатоль Сямёнавіч, які ўжо памёр. Дык Анатоль і Інакенцій — гэта амаль як адна асоба, абодва такія ж бялявыя. Я яму нават пра тое сказаў. Ён пацвердзіў, што родзіч Смактуноўскага. Цяпер яго сын Яўген жыве ў Белавежскай пушчы. У канцы 40-х — пачатку 50-х працаваў ляснічым у пушчы і Сямён Іосіфавіч Смактуновіч, бацька Анатоля, выдатны чалавек і спецыяліст. Я таксама з ім добра быў знаёмы, нават прысвяціў яму сваю першую кнігу. Наогул карані Смактуновічаў ідуць з вёскі Пагарэльцы, і ў мяне няма ніякіх сумненняў, што Інакенцій Смактуноўскі — з беларусаў".

Яшчэ адно меркаванне — ад Яўгена Смактуновіча, які ў мінулым быў дырэктарам Белавежскай пушчы: "Я не магу сцвярджаць, што маю родавыя сувязі з вялікім артыстам. Але прозвішча вельмі рэдкае, сустракаецца у трох пушчанскіх вёсках".

З НАГОДЫ

Жартаўлівая муза Алега Карповіча

Ён мае свой адметны почырк, малюе хутка, шмат, ды яшчэ з добрым гумарам і густам. На выставе ў Міністэрстве замежных спраў цяпер прадстаўлена толькі невялічкая частка сяброўскіх шаржаў, гумарыстычных малюнкаў і міні-скульптур мастака

Іван Ждановіч

Як лыжка дарагая да абеду, так і газетны малюнак — у нумар. І мастак Алег Карповіч, даўно працуючы ў газеце "СБ-Беларусь сегодня", адточвае ў вірах вечнага рэдакцыйнага спеху свой рэдкі талент. Многіх здзіўляе: як магчыма — крэатыўна гумарыць дзень пры дні, знаходзячы для ўвасаблення задум пад традыцыйнай рубрыкай "Ёсць пытанне" ўсё новыя тэмы і вобразы… Між іншым, сяброўскія шаржы на вядомых усяму свету Ксюшу Сітнік, Максіма Мірнага, Аляксандра Рыбака, якія выходзілі ў газеце адразу ж, на інфармацыйнай хвалі іх знакавых перамог, — таксама ёсць на выставе. Мастак з калегамі ўмее ўбачыць важную з'яву ці падзею, хутка асэнсаваць яе, запамінальна і ярка падаць прама ў нумар. Ягоны канёк — жанр дасціпнай газетнай карыкатуры і сяброўскага шаржу. Арганічна глядзяцца на выставе Алега Карповіча і зробленыя ім скульптуры малых формаў. На іх лёгка пазнаць беларускіх знакамітасцяў, а таксама калег-журналістаў. Гаварылі на выставе і пра ўнікальную Алегаву калекцыю гарматных ядраў, якую ён з вялікім імпэтам збірае.

На вернісажы ў выставачнай зале Міністэрства замежных спраў мастака хораша прадстаўляў старшыня нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА Уладзімір Шчасны. Ён нагадаў, што за плячыма ў Алега Карповіча грунтоўная мастацкая адукацыя: ураджэнец Слоніма закончыў Мінскае мастацкае вучылішча імя А. Глебава, аддзяленне кніжнай графікі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Аформіў нямала кніжак, выйшлі зборнікі яго шаржаў і карыкатур, ён удзельнічаў у розных выставах, у тым ліку — у Бельгіі і Польшчы. Дарэчы, супрацоўнікі МЗС, разглядваючы малюнкі Алега, на якіх вобразна, арыгінальна адлюстраваны рэаліі нашага жыцця, выказвалі меркаванне: было б цікава паказаць выставу і ў беларускіх культурных цэнтрах за мяжой, у нашых дыппрадстаўніцтвах. І сапраўды, у фокусе газетных малюнкаў, ды яшчэ з таленавітай жартаўлівай падсветкай, можна ўбачыць і надзённыя клопаты беларусаў, і тое, што нас сёння асабліва хвалюе. Тонкі, дасціпны, часам і філасофскі гумар мастака зразумелы без перакладу. А работ — сотні, бо робіць іх майстар-гумарыст амаль штодзённа.

ВІТАЛІЙ ГІЛЬ

Мастак Алег Карповіч — майстар крэатыўнага гумару

Застаецца пажадаць калегу: жартаваць і надалей! Між іншым, на выставе ў МЗС было абвешчана, што Алег Карповіч запрошаны паўдзельнічаць у міжнародным "культурна-карыкатурным" праекце, прысвечаным глабальнай праблеме клімату. Яго задумалі мастакі Швецыі, а ў сярэдзіне мая выстава будзе дэманстравацца ў Музеі сучаснага мастацтва ў Мінску. Вядома ж, у Алега Карповіча нямала твораў і на гэтую актуальную тэму.

Глядзі, гуляй і перамагай

Выкладчыкі Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы распрацавалі электронны дапаможнік па фізкультуры

Гэта першы і пакуль адзіны ў СНД электронны падручнік па фізкультуры. Перавагі яго відавочныя: з ім можна прадэманстраваць школьнікам не толькі тэорыю, але і практычную тэхніку гульні. Калектыў распрацоўшчыкаў узначальваў кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры спартыўных дысцыплін ВНУ Віталь Храмаў. Па яго словах, дапаможнік — гэта магчымасць убачыць у хуткім і павольным тэмпах тэхніку выканання практыкаванняў. Можна спыняць кадры, пры дапамозе флэш-анімацыі разгледзець дэталі руху. Матэрыял звычайна дэманструецца пры дапамозе камп'ютарнага праектара прама ў спартзале.

Па меркаванні В. Храмава, добры вынік ад навучання на ўроках фізкультуры шмат у чым залежыць ад таго, ці дакладна разумеюць школьнікі, як трэба выконваць рухі. Распрацоўка дапамагае максімальна даходліва выкласці матэрыял, а значыць — знізіць верагоднасць узнікнення памылак.

Дарэчы, дапаможнік па баскетболе быў распрацаваны па замове Міністэрства адукацыі. Цяпер падрыхтаваны і праходзяць этап экспертызы аналагічныя прадукты па валейболе, футболе, лёгкай атлетыцы і атлетычнай гімнастыцы, аэробіцы. Эксперыментальныя заняткі, праведзеныя ў школах Гродна, паказалі: выкарыстанне электроннага падручніка на ўроку фізкультуры значна падвышае цікавасць дзяцей да баскетбола. Педэксперымент з выкарыстаннем дапаможніка праводзіцца ў шасці школах вобласці, шырока скарыстоўвацца ён будзе ў наступным навучальным годзе.

КРЫЖАВАНКА

Касмічная мазаіка



Па гарызанталі:

1. Птушыная … Беларуская назва Млечнага Шляху. 3. Упадзіна, якая акружана валамі, на Месяцы, Марсе і іншых планетах. 6. Назва першай серыі арбітальных станцый у былым Савецкім Саюзе. 8. Імя Жаброўскага, беларускага астранома, матэматыка XVI стагоддзя, які ўзначальваў будаўніцтва астранамічнай абсерваторыі ў г. Вільні і распачаў там астранамічныя назіранні. 10. Твор (жарт.). 11. Горад на Брэстчыне, бліз якога нарадзіўся астраном-аматар, пісьменнік, кампазітар Каятан Крашэўскі. 12. Ота … Прозвішча буйнога савецкага вучонага, ураджэнца Магілёва, імем якога названы Малая планета, кратэры на планетах і шэраг геаграфічных аб'ектаў на Зямлі. 15. Барыс … Сусветна вядомы амерыканскі вучоны ў галіне астранаўтыкі, фізікі, хіміі, філасофіі. Ён беларус, ураджэнец Карэліччыны. 6 красавіка яму споўнілася 101 год. 16. Міжнародная арганізацыя, у будынку якой у Нью-Ёрку знаходзіцца мадэль першага ў свеце савецкага спадарожніка Зямлі (абр.). 17. Спічастая гара, вышэйшы пункт Аўстраліі, якая носіць імя нашага суайчынніка Тадэвуша Касцюшкі. 18. Электрычна зараджаная часціца. 22. Самая яркая зорка ў сузор'і Ліра. 23. Прыгарад Санкт-Пецярбурга, дзе знаходзіцца буйная астранамічная абсерваторыя. У ёй працаваў ураджэнец Мсціслаўшчыны Дзмітрый Дубяга, пазней ён узначальваў Казанскую астранамічную абсерваторыю. 26. Рух газаў, дыму. 29. Першы "лятальны апарат", якім кіравала, паводле казак, Баба-Яга. 30. " … Венера". Верш Максіма Багдановіча. 1. … Пачобут-Адляніцкі. Імя беларускага астранома, які быў першым дырэктарам Віленскай астранамічнай абсерваторыі. 32. Пётр … Вядомы савецкі касманаўт, беларус, ураджэнец Брэстчыны.

Па вертыкалі:

1. Адзін з найгалоўных багоў славян, бог Сонца, сын Сварога. 2. Светлае кольца вакол дыска Сонца ці Месяца. 4. Дзяленне на крузе компаса. 5. Шматступенчатая … Лятальны апарат, правобраз якога больш за 350 гадоў таму вынаходзіў ураджэнец Віцебшчыны Казімір Семяновіч, аўтар вядомай на той час у Еўропе кнігі "Вялікае мастацтва артылерыі". 6. Горад на Міншчыне, радзіма таленавітага канструктара касмічных караблёў Сямёна Косберга, а таксама астранома Вітольда Цэраскага, які працаваў дырэктарам астранамічнай абсерваторыі Маскоўскага ўніверсітэта. 7. Бог грому і маланкі ў скандынаўскай міфалогіі. 8. Адценне мовы. 9. У некаторых народаў Расіі чараўнік, знахар. 13. Белка і … Мянушкі сабак, першых істот, якія пабывалі ў космасе. 14. Веснавы месяц, у якім нарадзіліся з 3-дзённым прамежкам часу касманаўты Юрый Гагарын, Валянціна Церашкова і Уладзімір Кавалёнак. 17. Сузор'е ў Паўночным паўшар'і неба, ці міфічны крылаты конь. 19. Спадарожнік планеты Нептун, адкрыты пры дапамозе амерыканскага касмічнага карабля "Ваяджэр-2". 20. Колькасць членаў сходу, дастатковая для прызнання яго рашэнняў правамоцнымі. 21. Зорка невялікіх памераў. 24. Рака, прыток Нёмана. 25. … ці Сахачы. Беларускія назвы сузор'я Вялікай Мядзведзіцы. 27. Павел … Выдатны савецкі авіяканструктар, ураджэнец г. Глыбокае. 28. Экватарыяльнае сузор'е.

Падрыхтаваў **Лявон Целеш.**

Адказы на крыжаванку

Па гарызанталі: 1. Дарога. 3. Кратэр. 6. "Салют", 8. Тамаш. 10. Опус 11. Пружаны. 12. Шмат. 15. Кіт. 16. ААН. 17. Пік. 18. Іон. 22. Вега. 23. Пружная. 26. Пага. 29. Струна. 30. Зорка. 31. Мадыін. 32. Кілмук.

Па вертыкалі: 1. Дажбог. 2. Ляо. 4. Румб. 5. Ракета. 6. Слуцк. 7. Тор. 8. Тон. 9. Шаман. 13. Страўка. 14. Сакавік. 17. Пегас. 19. Нептун. 20. Корум. 21. Кардік. 24. Уса. 25. Воз. 27. Сухі. 28. Арол.

Заснавальнік: Рэдакцыя газеты «СБ»
Рэдактар Віктар Харкоў

Адрас: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61

Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288—12—80; факс: +375 17 288—12—80

Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290—60—11
E—mail: golas_radzimy@tut.by

Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»

Аб'ём выдання: 1 друк. арк.
Тыраж: 1960
Заказ: 453

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
© "Голас Радзімы", 2011